**В. П. Дзігадзюк**

*Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт ім. І. П. Шамякіна*
*Мазыр, Рэспубліка Беларусь*
*e-mail: Valya.digadyuk@mail.ru*

# АКТУАЛІЗАЦЫЯ РЭТРАСПЕКТЫЎНАЙ ПРАСТОРЫ Ў СКЛАДАНЫХ СІНТАКСІЧНЫХ СТРУКТУРАХ

Артыкул прысвечаны даследаванню пытання вызначэння сінтаксічных сродкаў рэпрэзентацыі тэкставай катэгорыі рэтраспекцыі ў складаных сінтаксічных структурах. Падчас аналізу прыкладаў аўтарам прадстаўлены розныя тыпы складаных сінтаксічных структур з рэтраспектыўнымі даданымі, выяўлены іх асаблівасці - часавая арыентаванасць дзвюх відаў, эксплiцытная маркіраванасць дыскантынуума; дадатковае ўжыванне лексічных адзінак часу.

*Ключавыя словы:* катэгорыя рэтраспекцыі; форма дыскантынуума; тэкст; складаныя сінтаксічныя структуры; эксплiцытнасць; часавая мнагапланавасць; семантыка-сінтаксічныя адносіны.

**В. П. Дигадюк**

*Мозырский государственный педагогический университет имени И. П. Шамякина*
*Мозырь, Республика Беларусь*
*e-mail: Valya.digadyuk@mail.ru*

# АКТУАЛИЗАЦИЯ РЕТРОСПЕКТИВНОГО ПРОСТРАНСТВА В СЛОЖНЫХ СИНТАКСИЧЕСКИХ СТРУКТУРАХ

Статья посвящена исследованию вопроса определения синтаксических средств репрезентации текстовой категории ретроспекции в сложных синтаксических структурах. В ходе анализа примеров автором представлены различные типы сложных синтаксических структур с ретроспективными придаточными, выявлены их особенности – временная ориентированность двух видов, эксплицитная маркированность дискантинуума; дополнительное употребление лексических единиц времени.

*Ключевые слова:* категория ретроспекции; форма дискантинуума; текст; сложные синтаксические структуры; эксплицитность; временная многоплановость; семантико-синтаксические отношения.

**V. Digadyuk**

*Mozyr State Pedagogical University named after I. P. Shamyakin*
*Mozyr, Republic of Belarus*
*e-mail: Valya.digadyuk@mail.ru*

# ACTUALIZATION OF RETROSPECTIVE SPACE IN COMPLEX SYNTACTIC STRUCTURES

The article investigates the issue of determination of syntactic means of representation of the text category of retrospection in complex syntactic structures. During the analysis of the

examples the author presents different types of complex structures with syntactic retrospective predicative clauses. The peculiarities such as time orientation of two types, explicit marking of discontinuum, additional use of lexical means of time are defined.

*Key words*: category of retrospection; form of discantunuum; text; complex syntactic structure; explicity; temporal diversity; syntactic-semantic relationships.

На сучасным этапе развіцця мовазнаўства вялікая ўвага прызначаецца глыбокаму і ўсебаковаму вывучэнню тэксту, яго асаблівасцей. Актуальнасць рашэння задач у гэтым напрамку патрабуе розных падыходаў да разглядаемай праблемы – структурнага, стылістычнага, семантычнага, камунікатыўнага, псіхалінгвістычнага. Значны ўклад у развіццё гэтай галіне ўнеслі даследчыкі В. А. Маслава, М. М. Кожына, В. І. Маскальская, І. Р. Гальперын і інш [1; 2; 3; 4].

Вылучэнне тэкставых катэгорый і іх лінгвістычная рэпрэзентацыя – важнае пытанне лінгвістыкі тэксту. Адсутнасць у беларускім мовазнаўстве даследавання катэгорыі рэтраспекцыі прадвызначае актуальнасць вывучэння праблемы. Таму *мэта даследавання ў артыкуле – вызначыць сістэму моўных сродкаў рэпрэзентацыі катэгорыі дыскантынуума на матэрыяле мастацкага тэксту.*

Адзін з першых даследчыкаў тэкставых катэгорый, І. Р. Гальперын, разглядае рэтраспекцыю як граматычную катэгорыю, якая ў сукупнасці розных сродкаў моўнага выражэння дазваляе чытачу вярнуцца да «раней згаданай змястоўна-фактуальнай інфармацыі» [4, с. 106].

Катэгорыя рэтраспекцыі можа актуалізавацца рознымі лексічнымі, граматычнымі, сінтаксічнымі сродкамі як самастойна, так і дапаўняць адзін аднаго.

У сінтаксічнай сістэме беларускай мовы шырока функцыянуюць складаныя сінтаксічныя структуры, дзеянні ў якіх суадносяцца з часавай мнагапланавай прасторай. Так, намі выяўлены складаназалежныя сказы з рознымі тыпавымі класамі ў адпаведнасці ад сэнсавай і структурнай арганізацыі. Значэнне рэтраспектыўнасці ў такіх адзінках вызначаецца паводле сінтаксічнай сувязі даданай і галоўнай частак і характару семантыка-сінтаксічных адносін паміж імі.

Часцей за ўсё катэгорыя дыскантынуума праяўляецца ў складаназалежных сказах з даданай суб’ектнай рэтраспектыўнай часткай. У такіх сказах рэтраспектыўныя адносіны прадвызначаюць даданыя часткі, дзе сродкамі сувязі выступаюць злучальныя словы: *Суседка ўзрадавалася, пачала нешта шчабятаць пра тое, **як любіла нябожчыка і якім ён добрым чалавекам быў*** (Л. Рублеўская); падпарадкавальныя злучнікі: *Як добра, **што яна не паказала скрутак Марку!*** (Л. Рублеўская). Рэтраспектыўнасць падзей у дадзеных прыкладах

абумоўлена значэннем дзеянняў у дададзеных частках, якія ўжо адбыліся да моманту дзеяння ў галоўная частцы і характарызуюць, раскрываюць яе сэнс. Пры гэтым трэба адзначыць, што момант галоўнай частцы суадносіцца з момантам гутаркі (момант гутаркі ў нашым даследаванні мы разглядаем як момант у храналагічнай паслядоўнасці падзей у апавяданні, так і момант гутаркі персанажаў у дыялогах). Такім чынам, рэтраспектыўнае значэнне звязана з адносным ужываннем часавай формы дзеяння ў адносінах да абсалютнага часу, выражанага ў галоўнай частцы.

У складаназалежных сказах з дададанай рэтраспектыўнай прэдыкатыўнай часткай сродкам сувязі з’яўляюцца злучальныя словы: *Ворагі не былі ўпэўненыя, што гэты рыцар той,* ***чыёй смерці яны чакалі доўгія гады*** (Л. Рублеўская); *– Здаюся, здаюся. <...> Вы сапраўды менавіта такая,* ***якой я сабе ўяўляў****. І я... напэўна, у нечым такі,* ***як вы гіпатэтычна апісалі*** (Л. Рублеўская). У дадзеным выпадку рэтраспектыўнае значэнне дададанай часткі тлумачыць сэнс прэдыката, выражанага састаўным іменным выказнікам, галоўнай частцы.

Зрух у часавым кантынууме мастацкага тэксту можа адбывацца ў складаназалежных сказах з дададанай атрыбутыўнай часткай. Гэты тып сказу найбольш распаўсюджаны. На нашу думку, гэта звязана з тым, што ў мастацкім тэксце найбольш ужывальнымі з’яўляюцца суб’екты (прадметы, падзеі, з’явы, персанажы), якія патрабуюць удакладнення, апісання, характарыстыкі з часавага мінулага: *– <...> Чалавек са шнарам,* ***з якім ты пазнаёміўся ў лесе****, належыць да слаўнага роду, Вінцэсь* (Л. Рублеўская); *Нарэшце я ўзяла ў рукі невялікі стос жоўтых папер, перацягнуты выцвілай стужкай****, які даў мне Вінцук*** (Л. Рублеўская).

Назіраюцца выпадкі, калі сінтаксічная рэтраспектыўная сувязь падмацоўваецца лексічнымі адзінкамі часу: *Мы знайшлі месца****, дзе некалі знаходзіўся анёл****, – не ў самім касцёле, а звонку, у нішы.* (Л. Рублеўская); *– Усё ведаю... Але не пайсці, калі клічуць памерці за айчыну, ганебна. На гэтай зямлі кожны павінен мець права маліцца ў той царкве,* ***у якой маліліся продкі,*** *і гаварыць на той мове, на* ***якой яны гаварылі...*** (Л. Рублеўская). У такіх выпадках наяўнасць слоў з семантыкай прошлага ўдакладняе, а іншы раз з’яўляецца абавязковай для здзяйснення зруху ў часавай прасторы. Так, у наступнай тэкстаструктуры *Толькі туга бярэ, калі чую чарговае заданне,* ***якое яшчэ сем год таму паставіла б мяне ў позу берсерка:*** *ды нізавошта* (Л. Рублеўская) дададаная атрыбутыўная, ускладненая дадатковым адценнем умовы, здзяйсняе парушэнне кантынуума апавядання толькі з удзелам акалічнасці часу *сем год таму*. Наяўнасць дадзеных паказчыкаў вызначае нерэальныя адносіны да рэчаіснасці ў часавым мінулым.

Даданая аб’ектная частка складаназалежнага сказу вызначае рэтраспектыўныя адносіны да галоўнай, дапаўняе яе змест, які цесна звязаны з падзеямі ў мінулым. Сродкамі сувязі тут выступаюць злучальныя словы: *Дзяўчына апусцілася на цвёрдую скураную канапу і нарэшце паспрабавала асэнсаваць усё,* ***што з ёй адбылося*** **(**Л. Рублеўская). Акрамя сінтаксічнай сувязі, зрух на часавай плоскасці адбываецца з удзелам лексічных адзінак часу, што надаюць большую эксплiцытную маркiроўку рэтраспекцыі: *– Добра, Кася... Даруйце, дарэчы, за тое,* ***што я вам тады нагаварыў****, пра чашу Грааля* (Л. Рублеўская).

Зрэдку назіраюцца складаназалежныя сказы з даданымі часу, паміж часткамі якіх выяўляюцца рэтраспектыўныя часавыя адносіны. У такіх сказах даданая частка змяшчае ўказанне на пачатак ажыццяўлення таго, пра што гаворыцца ў галоўнай, што і прадвызначае змену ў часавым кантынууме: *Марцін,* ***пасля таго як праводзіў Сымона****, доўга сядзеў у пакоі, не запальваючы святла* (В. Іпатава).

У складаназалежных сказах з даданай прычыны дыскантынуум, які суадносіцца з адносным часам, раскрывае прычыну здзяйснення або нездзяйснення дзеяння, якое выражана ў галоўнай частцы: *Рваў на сабе валасы тысяцкі,* ***што не праверыў граматы прыезджых, адклаў на заўтрашні дзень,*** *таму што захварэў яго сын адзіны...* (В. Іпатава).

Менш ужывальнымі з’яўляюцца складаназалежныя сказы, у якіх рэтраспектыўныя падзеі даданай параўнальнай часткі характарызуюць шляхам параўнання тое, пра што гаворыцца ў галоўнай: *Яшчэ трохі, і ён знікне, растворыцца,* ***як раствараліся сярод немцаў прусы, як зніклі яцвігі*** (В. Іпатава).

Такім чынам, у складаназалежных сказах дадзеных тыпаў вызначаецца часавая арыентаванасць дзвюх відаў. Абсалютны час звязаны з момантам гутаркі персанажаў або слоў аўтара, які выражаны ў галоўнай частцы сказу. У адносінах да яго вызначаецца адносны час, які суадносіцца з рэтраспектыўным планам і рэалізуецца ў даданых частках. Таму ў такіх сінтаксічных адзінках мы назіраем эксплiцытную маркіраванасць дыскантынуума, што звязана з рознымі часавымі планамі (дзейктычнымі цэнтрамі).

Цікавымі для даследавання з’яўляюцца складаныя сказы з некалькімі даданымі часткамі, якім характэрна часавая мнагапланавасць. Звычайна гэта сказы з паслядоўным відам падпарадкавання, у якіх першая даданая выражае рэтраспектыўнасць да галоўнай, а другая даданая рэтраспектыўна характарызуе першую даданую частку. Такім чынам, у адной сінтаксічнай адзінкі рэалізуюцца тры і больш часавыя прасторы: *Радаслаў Дудкоўскі,* ***калі даведаўся, за каго я выйшла замуж,*** *цэлы год*

*аплакваў маю легкадумнасць ва ўсіх кампаніях* (Л. Рублеўская). Назіраюцца выпадкі рэтраспектыўнага напрамку ў сказах са змешаным падпарадкаваннем: *Калі манахі сустрэліся зноў, выявілася, **што той, што збег ад спакусы, захаваў сваю святасць, а другі, які ўзяў грошы, страціў яе**!* (Л. Рублеўская). Як бачым, дыскантынуум актуалізуецца ў розных тыпах даданых частак – атрыбутыўнай, аб'ектнай, часу.

Перамяшчэнне ў часавай прасторы можа ажыццяўляцца ў камбінаваных складаных сказах незгрупаванай і згрупаванай структуры. Дамінантная сувязь пераходу ў такіх структурна-семантычных блоках у план дыскантынуума прыпадае на бяззлучнікавую, таму і значэнне рэтраспектыўнай тэкстаструктуры разглядаецца ад семантыка-сінтаксічных адносін паміж гэтымі прэдыкатыўнымі часткамі. Так, у сказах незгрупаванай структуры ў спалучэнні злучальнай і бяззлучнікавай сувязі камбінавання маркерам пераходу ў іншую часавую плоскасць з'яўляецца значэнне прычыны: *Прайшло некалькі тыдняў, і паднялі ноччу князя: **абрабавалі нейкія прышлыя людзі купцоў на Гоцкім двары*** (В. Іпатава). У падобных сказах другая частка змяшчае рэтраспектыўную прычыну ажыццяўлення з'яў або падзей, пра якія гаворыцца ў першай, што вызначаецца дыферэнцыраванымі семантыка-сінтаксічнымі адносінамі частак.

У камбінаваных сказах згрупаванай структуры зварот у мінулае адбываецца ў спалучэнні бяззлучнікавай і падпарадкавальнай сувязі. Бяззлучнікавая сувязь з'яўляецца асноўнай, што і вызначае сэнсавыя адносіны паміж прэдыкатыўнымі блокамі. Наяўнасць апорных слоў у першай частцы, якія пашыраюцца ў рэтраспектыўнай, надаюць рэтраспектыўным адносінам значэнне тлумачэння: *Прыйшла яна сюды бледная, папалоханая вялікай **бядой: баярын Васілька патрабаваў яе ў халопкі замест доўгу, які вінен быў яму бацька, каваль Пуцята*** (В. Іпатава); *Пакуль, нарэшце, да яе не дайшоў **сэнс**, які хаваўся пад гэтай плыткасцю і акругласцю, – **ёй прапаноўвалася пайсці з інстытута! У які яна паступала тры гады запар! Дзеля паступлення «адтрубіла» два гады ў завадской бібліятэцы, каб назапасіць належны працоўны стаж! Чаму?!!*** (Л. Рублеўская). Як бачым з прыкладаў, другі блок надае разгорнутае рэтраспектыўнае азначэнне да пэўнага члену першага блоку «*бядой*», «*сэнс*», змест якога ён раскрывае.

Як паказаў аналіз моўнага матэрыялу, пераход у іншую часавую прастору яскрава вызначаецца ў розных тыпах складаных сінтаксічных структурах. Экспліцытнасць катэгорыі дыскантынуума часцей за ўсё праяўляецца ў складаназалежных сказах з даданай суб'ектнай, атрыбутыўнай, прэдыкатыўнай, аб'ектнай рэтраспектыўнымі часткамі. Акрамя таго, у мастацкай прасторы зрух у часе назіраецца ў складаных

структурах з дадзенымі часу, прычыны, параўнальнай часткай. Адзначана, што ў складаназалежных сказах дадзеных тыпаў вызначаецца часавая арыентаванасць дзвюх відаў – абсалютны і адносны час, у суадносінах якіх рэалізуецца рэтраспектыўны план. Часавая мнагапланавасць характэрна для складаных сказаў з некалькімі даданымі часткамі з паслядоўным і змешаным відам падпарадкавання. Перамяшчэнне ў часавай прасторы можа ажыццяўляцца ў камбінаваных складаных сказах незгрупаванай і згрупаванай структуры. Сінтаксічная рэтраспектыўная сувязь можа падмацоўвацца лексічнымі адзінкамі часу.

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што ў складаных сінтаксічных структурах назіраецца экспліцытная маркіраванасць дыскантынуума, што звязана з рознымі часавымі планамі. Катэгорыя рэтраспекцыі –неад'емная частка мастацкага тэксту, якая адыгрывае важную ролю ў станаўленні сюжэту, таму патрабуе далейшага свайго вывучэння.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Маслова, В. А. Лингвистический анализ текста. Экспрессивность : учеб. пособие для бакалавриата и магистратуры / В. А. Маслова ; под ред. У. М. Бахтикиреевой. – М. : Издательство Юрайт, 2018. – 201 с.
2. Кожина, М. Н. Стилистика русского языка : учебник / М. Н. Кожина, Л. Р. Дускаева, В. А. Салимовский. – 4-е изд., стереотип. – М. : ФЛИНТА : Наука, 2008. – 464 с.
3. Москальская, О. И. Грамматика текста / О. И. Москальская. – М. : Высшая школа, 1981. – 183 с.
4. Гальперин, И. Р. Ретроспекция и проспекция в тексте / И. Р. Гальперин // Текст как объект лингвистического исследования / И. Р. Гальперин ; отв. ред. Г. В. Степанов. – 9-е изд. – М., 2016. – С. 105–113.